СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

№ 19 (659)

# ГОЛАС ПАРТЫЗАНА

Аўторак 10 Жніўня 1943 года.

Орган Дамачаўскага Райкома КП(б)Б

Библиотека АН БССР

# СВАЕЙ САКРУШАЛЬНАЙ СІЛАЙ ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ГОНІЦЬ ВОРАГА НА ЗАХАД

## Над гарадамі ОРОЛ і БЕЛГАРАД зноў развіваецца Чырвоны сцяг

## ЗАГАД

### Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Генерал—палкоўніку Папову

Генерал—палкоўніку Сакалоўскаму

Генерал—арміі Ракасоўскаму

Генерал—арміі Ватуціну

Генерал—палкоўніку Каневу

Сёння, 5 жніўня войскі Бранскага фронта пры садзейнічанні флангаў войск Заходняга і Цэнтральнага франтоў, у выніку ажастачоных баёў авалодалі горадам ОРОЛ.

Сёння-ж войскі Стэпнога і Варонежскага франтоў зламілі супраціўленне праціўніка і авалодалі горадам БЕЛГАРАД.

Месяц таму назад 5 ліпеня немцы пачалі сваё летняе наступленне з раёнаў Орла і Белгарада, каб акружыць і знішчыць нашы войскі, знаходзячыеся ў Курскім выступу і заняць Курск.

Атразіў усе спробы праціўніка прарвацца да Курска з боку Орла і Белгарада, нашы войскі самі перайшлі ў наступленне і 5 жніўня, роўна праз месяц, пасля пачатку ліпеньскага наступлення немцаў, занялі ОРОЛ і БЕЛГАРАД.

Тым самым разаблачана легенда немцаў аб тым, што быццам-бы Совецкія войскі не ў састаянні весці летам паспяховае наступленне.

У азнаменаванне атрыманай перамогі 5, 129, 380 стралковым дывізіям, варваўшымся першымі ў г. Орол і вызваліўшы яго, прысвоіць найменаванне «Орлоўскія» і надалей іх іменаваць: 5 Орлоўская стралковая дывізія, 129 Орлоўская стралковая дывізія, 380 Орлоўская стралковая дывізія.

89 гвардзейскай і 305 стралковай дывізіям варваўшымся першымі ў г. Белгарад і вызваліўшым яго, прысвоіць найменаванне «Белгарадскіх» і надалей іх іменаваць: 89 гвардзейская Белгарадская стралковая дывізія, 305 Белгарадская стралковая дывізія.

Сёння 5 жніўня ў 24 гадзіны сталіца нашай радзімы--Масква будзе салютаваць нашым доблесным вайскам вызваліўшым ОРОЛ і БЕЛГАРАД, дванаццацю артылерыйскімі залпамі з сто дваццаці гармат.

За выдатныя наступальныя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруючым Вамі войскам, удзельнічаўшым у аперацыях па вызваленню ОРЛА і БЕЛГАРАДА.

Вечная слава героям паўшым ў барацьбе за свабоду нашай Радзімы.

Смерць нямецкім акупантам!

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы**
**Маршал Совецкага Саюза**
**І. СТАЛІН.**

5 жніўня 1943 года.

## Ад Совецкага інфармбюро

(З апер. зводак за 6, 7 і 8 жніўня).

На працягу 6 жніўня нашы войскі на Бранскім напрамку, перамагаючы супраціўленне ворага, працягвалі наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 6 да 10 км, занялі звыш 70 нас. пунктаў, у тым ліку г. Кромы.

4 жніўня нашы войскі, размешчаныя ў раёне паўночнее Белгарада, перайшлі ў наступленне на Харкаўскім напрамку і, за тры дні напружаных баёў прасунуліся ўперад ад 25 да 60 км. і занялі звыш 150 нас. пунктаў, у тым ліку горад і чыгуначную станцыю Золочаў, 2 раённых цэнтры, 5 чыгуначных станцый.

* * *

На працягу 7 жніўня нашы войскі на Бранскім напрамку працягвалі наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 10 да 12 км., занялі звыш 100 нас. пунктаў.

На Харкаўскім напрамку нашы войскі працягвалі паспяхова развіваць наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 10 да 18 км., занялі звыш 70 нас. пунктаў сярод іх гор. Грайворон, 5 чыгуначных станцый.

* * *

На працягу 8 жніўня нашы войскі на Бранскім напрамку працягвалі развіваць наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 6 да 12 км, занялі звыш 130 нас. пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр і чыгуначную станцыю Нарышкіно (20 км. заходнее Орла), чыгуачную станцыю Беднοты (28 км заходнее Орла) і 9 буйных нас. пунктаў (паўночна-заходнее Кромы).

На Харкаўскім напрамку нашы войскі працягвалі паспяхова развіваць наступленне і, прасунуўшыся ўперад ад 12 да 15 км., занялі звыш 60 нас. пунктаў, у тым ліку горад Багадухаў.

На другіх участках фронта нашы войскі вялі разведку і арт—мінамётную перастрэлку. На працягу 5, 6 і 7 жніўня нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 186 нямецкіх танкаў, збіта 319 самалётаў ворага.

## Натхнёныя гістарычным загадам

Загад таварыша Сталіна ад 5 жніўня вызваў новы парыў к баявым дзеянням у байцоў атрада Васіля Х.

Подрыўныя групы Апанаса Т. і Васіля К. зрабілі актыўны паход на чыгуначную дарогу ворага. Пад нямецкім абстрэлам падрыўнікі мужна выканалі сваю задачу. Яны 31 выбухам прычынілі вялікі ўрон чыгунцы

# ЛІКВІДАЦЫЯ ОРЛОЎСКАГА ПЛАЦДАРМА І ЗАНЯЦЦЕ СОВЕЦКІМІ ВАЙСКАМІ ГАРАДОЎ ОРЛА І БЕЛГАРАДА

У выніку ўпорных наступаючых баёў войскі Бранскага фронта, пры садзейнічанні з флангаў войск Заходняга і Цэнтральнага франтоў разграмілі адборныя часці нямецкай арміі, сасрадаточаныя германскім камандаваннем у раёне Орла, ліквідавалі Орлоўскі плацдарм ворага і 5 жніўня занялі горад Орол, які напрацягу амаль двух год знаходзіўся ў руках нямецкіх акупантаў. У гэты-ж дзень, 5 жніўня войскі Стэпнога і Варонежскага франтоў прарвалі фронт ворага і авалодалі горадам Белгарад.

Уся гэта аперацыя, бліскуча ажыццяўлёная Чырвонай Арміяй па плану Вярхоўнага Галоўнакамандавання распадаецца на два этапы:

1. Паспяховая ліквідацыя нашымі войскамі летняга наступлення нямецка-фашысцкіх войск, пачатага імі 5 ліпеня г. г. на Орлоўска-Курскім і Белгарадска-Курскім напрамках з мэтай акружыць і знішчыць Совецкія войскі, якія знаходзіліся ў Курскім выступу і заняць Курск.

2. Паспяховае наступленне Чырвонай Арміі на Орлоўскім і Белгарадскім напрамках, якое завяршылася паражэннем Орлоўскай і Белгарадскай групіроўкі ворага і заняццем нашымі войскамі гарадоў Орла і Белгарада.

### ПЕРШЫ ЭТАП БАЁЎ

## Правал нямецкага наступлення на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках

З раніцы 5 ліпеня буйныя сілы танкаў і пяхоты ворага пры падтрымцы многакалькаснай авіяцыі, перайшлі ў наступленне на Орлоўска-Курскім і Белгарадскім напрамках. Напярэдадні Гітлер выдаў загад, у якім гаварылася, што: «германская армія пераходзіць да генеральнага наступлення на Усходнім фронце», што ўдар, які нанясуць нямецкія войскі, «павінен мець рашучае значэнне і паслужыць паваротным пунктам у ходзе вайны» і, што «гэта апошняе сражэнне за перамогу Германіі».

Нямецкая армія, прадпрыняўшы «рашучае наступленне», страціўшы вялікую колькасць людской сілы, танкаў, самалётаў, гармат, не толькі не дабілася аператыўных, але не дабілася нават і тактычных поспехаў. Нашы войскі перамалоўшы дывізіі ворага, кінутыя ў наступленне, самі нанеслі адказны магутны ўдар па наступаючай арміі ворага.

Такім чынам летняе наступленне нямецкіх войск, на якое гітлераўцы ўскладвалі вялікія надзеі, правалілася.

У бясплодных імкненнях заўладзець Курскім плацдармам і тым самым падрыхтаваць умовы для паходу з Орлоўскага плацдарма на Маскву, нямецка-фашысцкія войскі, за час з 5 па 23 ліпеня, страцілі 2900 танкаў, 1039 гармат, з іх 195 самаходных, 1392 самалёты, звыш 5000 аўтамашын і больш 70 000 салдат і афіцэраў.

Так кончылася чарговая авантюра гітлераўцаў.

### ДРУГІ ЭТАП БАЁЎ

## Паспяховае наступленне Совецкіх войск на Орлоўскім і Белгарадскім напрамках

Совецкія войскі не толькі сарвалі летняе наступленне немцаў, але і самі перайшлі ў рашучае наступленне супроць груповак варожых войск, размешчаных у Орлоўскім выступе і ў раёне Белгарада, наносячы немцам цяжкія страты.

За 22 месяцы ў Орле немцы зрабілі Орлоўскі плацдарм у магутны ўмацораны вузел.

Совецкія войскі, размешчаныя паўночнее, усходнее і паўднёвее Орла 12 ліпеня перайшлі ў рашучае наступленне ў агульным напрамку на Орол. Нямецкае камандаванне загадала сваім вайскам абараняўшым Орлоўскі выступ, не адступаць ні на адзін шаг і сражацца да апошняга салдата. У раёне Орла ўвесь час прыбывалі папаўненні з Германіі, паспешна перакідваліся войскі з другіх участкаў фронта.

Выконваючы загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Чырвоная Армія, нягледзячы на праліўныя дажджы і бездаражжа, перамагаючы ўпорнае супраціўленне ворага, безперапынна прасоўвалася ўперад, прарвала на ўсю глыбіню нямецкія абарончыя лініі і 5 жніўня, пасля жорсткіх вулічных баёў, авалодала горадам Орол.

На Белгарадскім напрамку нашы войскі 4 жніўня перайшлі ў наступленне, прарвалі абарону ворага і авалодалі горадам Белгарад.

За час баёў нашых войск на Орлоўскім напрамку з 24 ліпеня па 6 жніўня і на Белгарадскім напрамку з 4 па 6 жніўня нашы войскі знішчылі салдат і афіцэраў ворага звыш 50000, самалётаў—1 100, танкаў—1705, гармат усіх калібраў—584, аўтамашын—6000.

Усяго за месяц баёў на Орлоўскім і Белгарадскім напрамках з 5 ліпеня по 6 жніўня Чырвоная Армія нанесла ворагу наступ. страты: забіта салдат і афіцэраў—120 000, падбіта і знішчана танкаў—4 605, гармат—1623, аўтамашын—11 000, збіта самалётаў—2492.

За гэты-ж час нашы войскі захапілі: танкаў—521, гармат рознага калібра—875, кулямётаў 2521, розных складаў—325. Узята ў палон 12 418 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Такім чынам, Чырвоная Армія выконваючы план Вярхоўнага Галоўнакамандавання, за месяц баёў ліквідавала наступленне немцаў на Курск, нанесла вялікае паражэнне групіроўцы адборных фашысцкіх войск, ліквідавала Орлоўскі плацдарм ворага і вызваліла ад фашысцкіх захопнікаў гарады Орол і Белгарад.

Правал летняга наступлення немцаў і паражэнне варожых войск пад Орлом і Белгарадам гавораць аб тым, што Чырвоная Армія ва ўмовах лета змагла не толькі замацаваць, але і развіць свае наступаючыя поспехі.

Цяпер канчаткова рухнулі надзеі немцаў і іх прыхвасняў на спрыяючы паварот ваенных дзеянняў ва ўмовах лета.

Тым самым разаблачана сказка ворага аб тым, што быццам-бы Совецкія войскі не здольны вясці летам паспяховае наступленне.

Такія ітогі летніх баёў на Совецка-германскім фронце.

СОВІНФАРМБЮРО

Рэдкалегія